К. А. КАЛОДЗІЧ
Пінск, ДУА “СШ № 9 г. Пінска”

ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ВУЧНЯЎ ЯК ЭФЕКТЫЎНЫ СРОДАК ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАГА І ТВОРЧАГА РАЗВІЦЦЯ

Даследчая дзейнасць вучняў якэфектыўны сродак іх інтэлектуальнага і творчага развіцця – пашырэннепазнавальных інтарэсаў, практычных навыкаў вучняў, іх інтэлектуальнага ітворчага патэнцыялу праз прымяненне праектна-даследчых метадаў навучанняна ўроках і ў пазаўрочны час.

Задачы даследчай дзейнасці:

фарміраваць цікавасць, неабходнасць у даследчай дзейнасці;

развіваць у вучняў якасці творчай асобы;

забяспечыць авалоданне вучнямі метадаў навуковага пазнання, навыкамі самастойнай работы і навыкамі самааналізу і самадыягностыкі;

фарміраваць навыкі па прымяненні атрыманых ведаў, уменняў і навыкаў у практычнай дзейнасці.

Сучаснае грамадства ставіць задачы якасных змяненняў у дзейнасці ўсèйшколы, надаючы вялікае значэнне фарміраванню здольнасці вучня дасамастойнага пошуку інфармацыі. Ад нашага разумення значнасці гэтыхуменняў і гатоўнасці да фарміравання адпаведных навыкаў у вучняў залежыцьне толькі поспех дзяцей у пазнаваўчай і практычнай дзейнасці, але і ў пэўнайступені верагоднасць іх сацыяльнай адаптацыі. Усе гэта абумоўліваенеабходнасць прымянення ў адукацыйнай прасторы школы даследавання яксродка, які арганізуе вучэбную дзейнасць вучня. У цяперашні час, бадай, нямашколы, у якой не гаварылі б аб даследаванні, аб рознаўзроўневайдыферэнцыяцыі, аб педагагічных тэхналогіях, якія накіраваны на арганізацыюсамастойнай работы школьнікаў.

Адной з найболыш эфектыўных і сучасных форм здзяйсненнясамастойнага навучання з'яўляецца выкананне школьнікамі самастойныхдаследаванняў. Чаму? Гэта абумоўлена некалькімі прычынамі. Па-першае,прыроджаная цікаўнасць дзяцей і іх цяга да пераасэнсавання свету робяцьдаследаванне вельмі важнай для іх сферай дзейнасці. Па-другое, выкананнедзецьмі самастойных даследаванняў дае магчымасць задаволіць іхіндывідуальныя патрэбнасці і запыты, іх індывідуальныя магчымасці, гэта значыць максімальна індывідуалізаваць навучанне. Напрыклад, на ўроку па беларускаймове ў 6 класе пры вывучэнні тэмы “Назоўнікі адушаўлёныя і неадушаўлёныя” я стаўлю наступныя задачы:

1. Стварыць умовы для асэнсавання вучнямі спецыфікі значэння марфалагічнай прыметы “адушаўлёнасць” і “неадушаўлёнасць” назоўнікаў, абапіраючыся на сэнс і суаднесенасць граматычных формаў роднага і вінавальнага склонаў множнага ліку з назоўным, адрозніваць гэту катэгорыю ад біялагічнага паняцця “жывое-нежывое”.

2. Выпрацоўваць уменні адрозніваць у тэкстах адушаўлёныя і неадушаўлёныя назоўнікі.

3. Развіваць лексіка-граматычны лад маўлення вучняў, ствараць умовы для развіцця маўлення школьнікаў.

Так, на дадзеным уроку можна выкарыстоўваць наступныя метады і прыёмы для развіцця даследчай дзейнасці:

На этапе тлумачэння новай тэмы:

Самастойнае набыццё ведаў. Работа ў парах “Ты мне, я табе”

Любое даследаванне пачынаецца з тэарэтычных ведаў - вучні звяртаюцца да падручніка. Першы варыянт даследуе інфармацыю пра адушаўлёныя назоўнікі, 2 варыянт – пра неадушаўлёныя. Потым абменьваюцца атрыманай інфармацыяй.

На этапе замацавання:

“Бюро знаходак”. (Праца з тэкстам у парах). На кожную парту даюццатэксты.Заданні:

1. Дакажыце, што гэта тэкст.
1. Вызначце тэму і асноўную думку.
2. Знайдзіце адушаўлёныя і неадушаўлёныя назоўнікі.
3. Вызначце іх ролю ў тэксце.
4. Ці часта назоўнікі сустракаюцца ў тэкстах?

Для 1 рада. Вясновым ранкам я выйшаў на бераг Нёмана. Нідзе нікога не былобачна. 3-за Нёмана чуліся галасы кнігавак. Нішто не перашкаджала час адчасу булькатаць імклівай вадзе. Буслы, нічым не ўстрывожаныя, спакойназаклекаталі: “Сустракайце, мы прыляцелі на родныя гнёзды!”.

Для 2 рада. Красавік. У хвойніку заспявалі берасцянкі. Ніхто не перашкаджае іхспеву. На ўзлеску нікога не відаць. Блакітнымі агеньчыкамі мігцяцьпралескі. Што за цуды можна ўбачыць у гэты час!

Для 3рада. Вясна пачалаася неяк раптоўна. У небе заспяваў жаваранак. Людзі,якія чулі гэты дзіўны спеў, спыняліся. Але ніхто не мог адшукаць яго ўяркім вясновым блакіце. Жаўранкавым спевам звінела ўсё наваколле.

“Будаўнікі”

На дошцы на асобных лістах хаэтычна расстаўлены словы. Трэба іх папарадку размеркаваць. Складзены сказ з рассыпаных слоў запішыце ў сшытак.

“Лепш у сваякоў з голаду ўмерці, чым у чужакоў золата збіраць”.

1. Зачытайце атрыманы сказ і растлумачце яго сэнс.

2. Знайдзіце словы, у якіх схаваны арфаграмы, растлумачце іх правапіс.

3. Назавіце назоўнікі ў сказе.

4. Знайдзіце назоўнікі, якія адносяцца да адушаўлёных, а якія да неадушаўлёных.

На этапе рэфлексіі:

“Канструктары”. Праца з карцінай.

Настаўнік: Любы даследчы інстытут не абыходзіцца без эксперыментаў. Мытаксама паспрабуем правесці эксперымент. Перад вамі карціна “Першы дзень зімы”. Паглядзіце ўважліва і скажыце, якая пара года адлюстравана. Калі ласка, апішыце яенекалькамі сказамі. Увага! У тэкстах павінны быць адушаўлёныя і неадушаўлёныя назоўнікі. Пасля самастойнай работы зачытваюцца 2-3 тэксты.

“Фантазѐры”

Настаўнік: Кожны даследчык - гэта маленькі фантазѐр. Давайце паспрабуемпафантазіраваць на тэму “Калі б я быў..., то...”, ужываючы адушаўлёныя і неадушаўлёныя назоўнікі. Напрыклад: Калі б я была ўрачом, то лячыла б усіх на свеце. Сказ дапісвае кожны з вас.

Нарэшце, развітая здольнасць да правядзення самастойныхдаследаванняўне на словах, а на справе дае магчымасць падлеткам стаць больш-меншнезалежнымі ў спасціжэнні свету, у задавальненні сваіхпазнаваўчыхпатрэбнасцяў.

Праблему даследчай дзейнасці ў школе разглядалі на працягу многіх гадоўА.Ф.Ануфрыеў, А.І.Біруля, П.Вайнцваг, І.М. Кузняцоў, Ю.М.Куражкоўскі,А.В. Леантовіч, Н.Б.Шумакова, В.П. Вахцераў. Адным з першых прыхільнікаўметаду даследавання як асновы навучання школьнікаў можна лічыцьЯ.А.Каменскага. Самы палымяны абаронца і прапагандыстактыўных метадаў навучання, у аснове якіх ляжыць эўрыстычны метад абометад даследавання, В.П.Вахцераў гаварыў, што “адукаваны не той, хто многаведае, а той, хто хоча многа ведаць і хто ўмее здабываць гэтыя веды”. Ёнпадкрэсліваў выключную важнасць мысліцельных уменняў школьнікаў –умення аналізаваць, параўноўваць, камбінаваць, абагульняць і рабіць вывады,важнасць умення карыстацца прыѐмамі навуковага даследавання хаця б і ўсамай элементарнай форме. Для таго, каб школьнік авалодаў гэтымі ўменнямі,неабходны іншы метад навучання – эўрыстычны, а не рэпрадуктыўны.Настаўнік у гэтым выпадку толькі ставіць перад вучнем задачу, дае матэрыялы, авучань сам адкрывае тое, што было адкрыта або вынайдзена да яго. У гэтымвыпадку вучань не

толькі здабывае веды, але вучыцца таму, як іх здабыць, яксамому назіраць, эксперыментаваць, абагульняць, параўноўваць, класіфікаваць.